# БЕЛАРУСКІ ГУРТ ПРАДЭМАНСТРУЕ Ў ОСЛА НУМАР У СТЫЛІ «АВАТАРА»?

**Здарылася... не, не страшнае, наадварот, доўгачаканае — тэлеканалы-канкурэнты аб'ядналіся і выступілі партнёрамі, каб забяспечыць сёлета годны і яркі ўдзел Беларусі ў «Еўрабачанні». Функцыі арганізатара і вяшчальніка выконвае Белтэлерадыёкампанія, як адзіны ў нашай краіне член Еўрапейскага вяшчальнага саюза, фінансавы ж бок справы цалкам узяў на сябе тэлеканал АНТ, «гадаванец» якога, гурт «Тры плюс два», якраз і спяе сёлета ад нашай краіны на еўрапейскай сцэне песню «Far away».**

Чаму менавіта яны, гэтыя мала вядомыя шырокай публіцы пяцёра маладых людзей? Гэтым рэзонным пытаннем задаліся не толькі журналісты, але і прыхільнікі самога конкурсу, выказваючы самыя розныя здагадкі і меркаванні. (Прынамсі ў «Звяздзе» некалькі дзён разрываўся рэдакцыйны тэлефон.). Намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка ў адказ напаўжартам задаў сустрэчнае пытанне: а чаму б і не? «Давайце спрабаваць, эксперыментаваць — мы як вяшчальнікі будзем толькі рады, калі ў гурта атрымаецца выступіць лепш, чым у папярэдніх нашых удзельнікаў. А ўвогуле вырашальным фактарам было тое, што спадар Хоміч (першы намеснік старшыні праўлення АНТ) сказаў: «Мы зоймем першае месца». Мы яму паверылі». Калі ж сур'ёзна, то фокус-група проста выказвала меркаванне па ўсіх заяўленых песнях — падабаецца—не падабаецца. Выходзіць, што сумесны твор кампазітараў Леаніда Шырына, Юрыя Вашчука і аўтаркі тэксту спявачкі Геры, «Far away», спадабалася найбольш.

«У іх ёсць шчырасць, арыгінальнасць і маладосць, яны вельмі натуральныя», — так ахарактарызаваў пасля знаёмства ўдзельнікаў гурта легендарны танцор Андрыс Ліепа, з якім заключана папярэдняя дамова аб супрацоўніцтве і падрыхтоўцы артыстаў да конкурсу. Праўда, якой будзе пастаноўка нумару, арганізатары яшчэ і самі не ведаюць на 100 працэнтаў, аднак мяркуюць выкарыстаць матывы і настрой папулярных сёлета фільмаў «Аватар» і «Аліса ў краіне цудаў». «Чаго хоча публіка? Веры ў фэнтэзі, у тое, што на свеце існуе такое райскае месца, дзе кожны знаходзіць шчасце... Зыходзячы з гэтага трэнду, мы і будзем ставіць нумар», — разважае Сяргей Хоміч. Беларускі бок таксама плануе па максімуму выкарыстаць дазволеную правіламі «Еўрабачання» квоту — 6 чалавек на сцэне — і дабавіць або яшчэ аднаго вакаліста, або танцора. Пакуль жа «3+2», як і выцякае з назвы, гучыць на 5 галасоў.



Фота прэс-службы БТРК.

## Хто ёсць who

Юлія Шышко (3) — нарадзілася ў Петрыкаве, але расла і вучылася ў Слоніме. На «выдатна» скончыла школу, потым Гродзенскі музычны каледж па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне». Цяпер 21-гадовая Юля — студэнтка музычнага аддзялення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры.

Алена і Нінэль Карповіч (1,5) — сёстры-блізняты нарадзіліся ў Мінску, з самага дзяцінства вырашылі звязаць жыццё з музыкай — спачатку была школа з музычным ухілам, потым — Рэспубліканскі каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка, цяпер жа — Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі па класе «харавое дырыжыраванне». У сямейна-творчым тандэме Алена — спакойная і разважлівая, Нінэль — эмацыйная і экспрэсіўная. Дарэчы, 3 сакавіка дзяўчатам споўніцца 25 гадоў.

Егіязар Фарашан (2) — нарадзіўся ў Арменіі 21 год таму, але ў 5-гадовым узросце прыехаў з бацькамі ў Беларусь і... сям'я тут і засталася. Вакальныя здольнасці хлопца выявіла маці — педагог па вакале. Спачатку Егіязар не ставіўся да спеваў сур'ёзна — пакуль упершыню не перамог на конкурсе. Сёння ў яго за плячыма ўжо дзевяць перамог у міжнародных конкурсах, і, як мяркуюць спецыялісты, вялікія перспектывы на будучыню.

Арцём Міхаленка (4) — самы малодшы з удзельнікаў гурта (яму толькі нядаўна споўнілася 20 гадоў), але разам з тым і самы гаваркі. Нарадзіўся ў пасёлку Алекшыцы Бераставіцкага раёна. Захапіўся музыкай у 4 гады і самастойна навучыўся граць на баяне, акардэоне, гармоніку. Скончыў Гродзенскі каледж мастацтваў, цяпер — студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Акрамя музыкі, захапляецца спортам — плаванне, бокс, лыжы.

— Ці будзе неяк мяняцца стыль удзельнікаў? — цікавімся ў Сяргея Хоміча. — Бо ўсе яны цёмнавалосыя — нейкая змрочная «фэнтэзі» атрымліваецца...

— Будзе. Можа атрымацца, што кагосьці з хлопцаў асвятлім, разглядаем варыянты і з дзяўчатамі. Пакуль што ўсім артыстам даручылі адрошчваць валасы, а некалькі беларускіх і расійскіх стылістаў распрацоўваюць вобразы для гурта. Мы будзем выбіраць лепшае. Тое ж датычыцца і нумара — пэўныя ідэі ёсць у нас, свае прапановы рыхтуе Андрыс Ліепа — мы іх спалучым і абяром найлепшыя.

— Ці няма ў запрашэнні Андрыса Ліепы да пастаноўкі пэўнай рызыкі? Усё ж гурт складзены не з танцораў, а з вакалістаў, і часу на падрыхтоўку ў іх зусім няшмат.

— Безумоўна, яны не могуць рабіць кульбіты на сцэне, гаворка ідзе пра такія рухі, якія былі б арыгінальнымі і цікавымі, і пры тым не перашкаджалі якаснаму «жываму» выкананню.

Значная частка работы — прома-выступленні ў тых краінах, што будуць выступаць разам з Беларуссю ў першым паўфінале «Еўрабачання» і змогуць галасаваць за нас, пастаноўка нумара, пашыў касцюмаў, змена вобразаў — яшчэ наперадзе. Пакуль жа — цяжкая, але не менш важная руціна: артысты штодня займаюцца з харэографам Вольгай Шабровай, з педагогамі па вакале, з вопытным выкладчыкам англійскай мовы. Дзеля гэтага ўсе яны з 1 сакавіка ўзялі ў Прэзідэнцкім аркестры Беларусі водпуск за свой кошт.

## Ёсць пытанне

Што будзе з 50 000 долараў, якія тэлеканал АНТ некалі паабяцаў аўтару песні для «Еўрабачання»? Гэтыя грошы ўжо знайшлі свайго гаспадара альбо будуць чакаць пераможцу праекта «Музычны суд»?

Як запэўнілі нас прадстаўнікі тэлеканала, 50 тысяч долараў у любым выпадку былі адрасаваныя аўтарам песні, якая паедзе на «Еўрабачанне» — нават калі гэтая песня з'явілася б не ў межах адбору АНТ. Так што грошы дастануцца Леаніду Шырыну, Юрыю Вашчуку і Геры — аўтарам песні «Far away». Акрамя таго, пераможцы двух сезонаў «Музычнага суда» атрымаюць у якасці прыза гасцявую паездку на «Еўрабачанне-2010».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**